нях: зб. дакладаў III Навуковых чытанняў памяці Л.С. Мухарынскай, Мінск, 24-25 сакавіка 1994 г.– Мінск, 1996.– С. 89.
8. Костюковец, Л.Ф. Кантовая культура в Белоруссии / Л.Ф. Костюковец. – Минск: Высшая школа, 1975. – 96 с.
9. Котляревский, Л.А. О погребальных обычаях языческих славян / Л.А. Котляревский. – М., 1868. – 252 с.
10. Котляревский, Л.А. Русская народная литература / Л.А. Котляревский // Сочинения / Л.А. Котляревский. – СПб., 1893. – Т. I. – 521 с.
11. Музычны слоўнік беларуска-рускі / аўт.-склад.: Г.Р. Куляшова [і інш.]; навук. рэд. Г.Р. Куляшова, Л.А. Антанюк. – Мінск: Беларуская навука, 1999. – 559 с.
12. Музыкальный энциклопедический словарь / гл. ред. Г.В. Келдыш. – М: Советская энциклопедия, 1990. – 672 с.
13. Соколов, Ю.М. Духовные стихи / Ю.М. Соколов // Русский фольклор / Ю.М. Соколов. – М., 1941. – С. 284 – 291.
14. Толстой, Н.И. Несколько слов о новой серии и новой книге Г.П. Федотова / Н.И. Толстой // Стихи духовные (русская народная вера по духовным стихам) / Г.П. Федотов. – М., 1991. – С. 5 – 19.
15. Федотов, Г.П. Стихи духовные (русская народная вера по духовным стихам) / Г.П. Федотов. – М.: Прогресс, Гнозис, 1991. – 127 с.
16. «Хлеб душе»: зборник молитов и набожных песен для русского народу Александра Духновича (в переробце). – Винтерберг: Изд-во Штейнбренера, 1837. – 383 с.
17. Сборник духовных песен священника Иакова Коляды, г. Браслав [Рукопись]. – 115 с. (хранится у протоиерея Николая Коляды, настоятеля Свято-Георгиевской церкви г. Витебска).

***Дожына Н.І.*** *(Беларусь, г. Мінск)*

## ЦАРКОЎНА-ПЕЎЧАЯ РУКАПІСНАЯ ТРАДЫЦЫЯ ВЕТКАЎСКАГА САГЛАСА СТАРАВЕРАЎ НА БЕЛАРУСІ

У апошні час усё больш пільную ўвагу навукоўцаў прыцягваюць розныя з'явы стараабрадніцкай культуры: літаратурная дзейнасць, мастацкая творчасць, абрадавасць, вусныя і пісьмовыя музычныя традыцыі. Асаблівы інтарэс му-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зыказнаўцаў-медыявістаў канцэнтруецца на пеўчых помніках стараабрадніцкай культуры і, шырэй – рэгіянальных кніжных традыцыях старавераў, гісторыі стараабрадніцкіх цэнтраў XVIII – XIX стст. як заключным этапе ў развіцці шматвяковага глыбіннага пласта прафесійнай музычнай культуры.

Стараабрадніцтву належыць неацэнная заслуга ў справе захаванасці і працягу унікальных традыцый старажытнарускага царкоўнапеўчага мастацтва. Да нашых дзён дзякуючы ім дайшлі каштоўныя рукапісна-кніжныя помнікі праваслаўнага богаслужэбнага спеву, на якіх не адбіліся ўплывы заходнееўрапейскай музыкі.

Выдатны даследчык старажытнарускага пеўчага мастацтва С. Смаленскі пісаў у гэтай сувязі пра старавераў, якія, «наўмысна замкнуўшыся ў паданнях і строгіх традыцыях старажытнага спеву, адхіснуўшыся ад "навін", свята і жыва захавалі роднае мастацтва ў лісце і на практыцы, аказваючы тым самым магчымасць зрабіць для нашай музычнай навукі самыя істотныя паслугі» [1, с. 41].

Захаванне традыцый як даніна мінуламу, перадача шматвяковага вопыту ў вуснай і пісьмовай форме – неад'емная частка духоўнай жыццядзейнасці старавераў. Таму менавіта старажытнарускае пеўчае мастацтва становіцца асновай і крыніцай рукапісных традыцый розных стараверскіх згод. Разам з тым, у выніку фарміравання канфесійных цэнтраў і складання лакальных пеўчых версій абраду староверы станавіліся стваральнікамі і носьбітамі самастойных музычных традыцый, якія атрымалі адлюстраванне ў іх пісьменнасці.

Феномен стараверскай культуры, які доўгі час разглядаўся навукоўцамі як паняцце адзінага недыферэнцыраванага парадку, даследуецца сёння з пункту погляду існавання, па-першае, культурных (у тым ліку музычных) традыцый розных стараверскіх згод; па-другое – іх лакальных праяў і мастацкіх версій у розных рэгіёнах кампактнага пражывання старавераў. Так, у стараверскіх цэнтрах і скрыпторыях Урала, Сібіры, Пячэрскага края і іншых месцах, дзе склаліся агмені паселішчаў старавераў беспапоўскага сагласа, знайшла праяву паморская пеўчая традыцыя. У Ветцы, Старадубе, Пецярбургу, Іргізе, Сярэднім Урале размяшчаліся цэнтры старавераў-папоўцаў, якія прытрымліваюцца гусліцкай традыцыі, што адыгрывала асабліва важную ролю ў папоўскай практыцы з сярэдзіны XIX ст. Менавіта гэтая традыцыя паслужыла ўзорам для пісцоў лакальных цэнтраў, у тым ліку і для старавераў веткаўскага сагласа.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку складанага ўзаемадзеяння ўзору і мясцовых асаблівасцей службаў узнікалі мясцовыя, або лакальныя, музычныя традыцыі. Праява мясцовай традыцыі знаходзіцца, па-першае, у мадыфікацыі саміх богаслужэбных абрадаў і, адпаведна, іх музычнага афармлення, звязаных з пераўтварэннем службы (яе скарачэннем або ўвядзеннем упадабаных у той ці іншай стараверскай суполцы спеваў); па-другое – у інтанацыйным узбагачэнні напеваў элементамі народнай (свецкай) музыкі, паколькі спевакі і пісары кніг паходзілі з народнага асяродку, што выхоўваў іх музычнае мысленне. Усё гэта забяспечвала існаванне і развіццё мясцовых традыцый, адной з якіх і з'яўляецца веткаўская.

Веткаўская рукапісная традыцыя, узнікненне якой адносіцца да канца XVII ст. і звязваецца з вядомым у той час на беларускіх тэрыторыях стараверскім скрыпторыем (Веткаўскім Пакроўскім манастыром), ужо ў сярэдзіне XVIII ст., як сведчаць пеўчыя рукапісы, дасягае свайго росквіту. Трапіўшы ў XIX ст. пад моцны ўплыў гусліцкіх рукапісаў, веткаўская традыцыя атрымлівае далейшае развіццё і лакальныя мадыфікацыі за межамі веткаўскіх тэрыторый.

Творчае жыццё стараверaў веткаўска-старадубскіх слабод, якое ўяўляе пэўную цікавасць з пункту погляду развіцця, мясцовага ажыццяўлення традыцый старажытнарускага пеўчага мастацтва, агульнарускай музычнай стараверскай традыцыі новага часу, мае прамое дачыненне да беларускай культуры, духоўных традыцый старaверства на землях Беларусі. Гэтая з'ява, што распаўсюдзілася на памежных руска-беларуска-ўкраінскіх землях, уяўляе таксама значную цікавасць для этнолагаў, лінгвістаў і фалькларыстаў. Насельніцтва веткаўска-старадубскіх тэрыторый з'яўляецца этнічна беларускім. Яно і па сённяшні дзень захоўвае беларускі дыялект, фальклор, абраднасць і іншыя этнаграфічныя прыкметы.

Веткаўска-старадубскія тэрыторыі ўяўляюць сабой «суцэльную культурна-этнічную суполку» (тэрмін В. Ялатава), дзе перасякаліся гістарычныя лёсы розных груп славянскага насельніцтва, якое праяўляла адзінства элементаў мовы, побыту, культуры і фальклору. Савецкі лінгвіст П. Растаргуеў, кваліфікуючы гаворкі дадзенай мясцовасці з пераважна беларускай архаічнай асновай, адзначае той факт, што пры падобнай аднадушнасці ў усё ж «нельга не аддаць некаторай перавагі мове беларускай» [2, с. 18].

У сувязі з гэтым звернем увагу на пазначэнне межаў веткаўска-старадубскіх слабод. Упершыню яны былі вызначаны ў 1970-я гады маскоўскімі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследчыкамі на чале з І. Паздзеевай, якія з 1971 г.праводзілі суцэльнае археаграфічнае вывучэнне гэтых месцаў: заходняя палова Бранскай вобласці, амаль уся Гомельская вобласць з выхадам на Віцебскую, а таксама поўнач Чарнігаўскай вобласці [3, с. 18].

Вывучэнне помнікаў духоўнага жыцця стараверaў веткаўскіх земляў, у тым ліку рукапісна-пеўчых, пачатае маскоўскімі навукоўцамі ў 2-й палове XX ст. складалася са збірання і вывазу кніг з гэтых тэрыторый у Маскву і Ленінград. Толькі невялікая іх частка заставалася ў Беларусі ў карыстанні саміх стараверaў і іх паслядоўнікаў або пазней трапляла ў музеі Веткі, Навазыбкава, Бранска, Гомеля і іншых найбольш буйных гарадоў гэтага рэгіёна ў параўнальна невялікай колькасці. Тым не менш даследчыкі Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта (МДУ) зрабілі значны ўклад у вывучэнне стараверскай кніжна-пеўчай культуры, выдаўшы зборнікі комплексных даследаванняў «Русские письменные и устные традиции и духовная культура» і «Из истории фондов Научной библиотеки Московского университета» [3; 4]. У гэтыя зборнікі ўвайшлі матэрыялы экспедыцый 1960 – 1980-х гадоў у розныя вобласці СССР, дзе захаваліся стараверскія паселішчы. Зборнікі ўключаюць артыкулы маскоўскіх навукоўцаў-медыявістаў – гісторыкаў і археолагаў, філолагаў і фалькларыстаў, мастацтвазнаўцаў і музыказнаўцаў. Сярод іх неабходна назваць аўтараў прац па праблемах кніжна-пеўчай спадчыны, якія маюць дачыненне да беларускіх земляў: І. Паздзееву, М. Багамолаву, Н. Кабяк, Л. Ігашава, Э. Гусеву і інш.

Вялікая частка артыкулаў створана гэтымі даследчыкамі на матэрыялах калекцыі пеўчых кніг, якія ўвайшлі ў Веткаўска-Старадубскі збор Навуковай бібліятэкі МДУ. Нягледзячы на тое, што гэтая тэрытарыяльная калекцыя разглядаецца аўтарамі толькі аглядна, дадзенае даследаванне мае важнае метадалагічнае значэнне. Яго па праву можна лічыць першым этапам на шляху вывучэння стараверскіх пеўчых традыцый у Беларусі.

У сучаснай беларускай навуцы з'яўленне зацікаўленасці да стараверства адзначана ў 80-я гады XX ст. Сярод беларускіх навукоўцаў, якія разглядалі праблемы стараверства, галоўным чынам, у гісторыка-культуралагічным і сацыялагічным аспектах, неабходна назваць Т. Кароткую, А. Пракошыну, А. Чуднікаву, А. Гарбацкага. У даследчых працах гэтых аўтараў вырашаюцца праблемы гісторыі ўзнікнення і развіцця стараверства на беларускіх землях, а

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

таксама яго духоўнага і культурнага жыцця, матэрыяльных, мастацкіх і творчых пошукаў.

Гісторыя і культура стараверства ў Беларусі, на іх думку, бяруць пачатак з часоў перасялення старавераў у 2-й палове XVII ст. з расійскіх губерняў (Маскоўскай, Кастрамской, Калужскай, Наўгародскай і інш.), а таксама з Памор'я, Маларосіі, з берагоў Дона на беларускія тэрыторыі ў выніку шматлікіх уціскаў і ганенняў з боку рускага царызму. Пастулова тут з'яўляліся стараверскія цэнтры, якія размяшчаліся ў паўночным і паўночна-заходнім рэгіёнах Беларусі: у Віцебскай вобласці (Браслаўскі і Міёрскі раёны, гарады Браслаўль, Полацк, Віцебск, Лепель), Магілёўскай вобласці (Бабруйскі раён), дзе пасяляліся, у асноўным, беспапоўцы, і ў паўночна-ўсходняй частцы Беларусі, заселенай пераважна папоўцамі, або так званымі беглапапоўцамі, і ў невялікай колькасці – беспапоўцамі. У гэтым рэгіёне гарадамі іх рассялення былі Орша, Сенна, Магілёў, Мсціслаў, Рэчыца, Гомель, Ветка. Найбольш буйным цэнтрам папоўшчыны і ўвогуле стараверства ў Беларусі, стала Ветка. Менавіта гэтая тэрыторыя ўяўляе найбольшую цікавасць з пункту погляду вывучэння пеўчай традыцыі старавераў. З'яўляючыся «ядром» і неад'емнай часткай веткаўска-старадубскіх слабод, яна мае не толькі багатую гісторыю, інфармацыю пра якую можна знайсці ў дакументальных і літаратурных крыніцах, але і захаваную ў гэтых месцах спадчыну кніжна-пеўчых помнікаў, што сведчыць пра функцыянаванне тут суцэльнай музычнай традыцыі.

Ветка славілася у свой час як адзін з буйных духоўных і культурных цэнтраў стараверства на землях Беларусі. Сёння невялікае беларускае мястэчка ў Гомельскай вобласці, у канцы XVII ст. яно знаходзілася за межамі Расіі і ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай. У 2-й палове XVII ст. тэрыторыя Веткі, якая ўяўляла сабой сукупнасць рускіх стараверскіх паселішчаў і названая так па першым з іх, належала польскім землям пана Халецкага да 1-га падзелу Рэчы Паспалітай (1772), калі гэтыя землі адышлі да Расійскай дзяржавы. Спецыфіка станаўлення Веткі абумоўлена ў большай ступені складанымі гістарычнымі перыпетыямі. Паводле гістарычных дакументаў, першыя старавeры з'явіліся ў Ветцы са Старадубскага боку, куды яны збеглі з розных расійскіх губерняў ад праследавання ўрада, і заснавалі тут у 1680-я гады першае на тэрыторыі Беларусі паселішча з чатырнаццаццю (па іншых звестках – каля дваццаці) слабодамі вакол яго (цяпер тэрыторыя Гомельскага, Веткаўскага і Добрушскага раёнаў. Даследчыкі культурных і гістарычных традыцый веткаўска-старадуб-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скіх тэрыторый называюць наступныя веткаўскія стараабрадніцкія слабоды, шматлікія з якіх існуюць і сёння: Косецкая (цяпер Косіцкая), Лявонцьеўская (цяпер Лявонцьева), Раманаўская (цяпер Раманавічы), Мар'іна, Тарасаўка, Папсуеўка, Буда, Крупец, Дубовы Лог, Касцюковічы, Гродна, Ніўкі, Мільча, Грабаўка, Спасаўка. Перасяліўшыся на беларускія землі, веткаўцы раўніва засцерагалі сваю духоўную культуру, разнастайныя элементы матэрыяльнай культуры аказаліся не настолькі ўстойлівымі. Як піша А. Манаенкава, рускія веткаўцы запазычылі беларускія назвы сваіх паселішчаў – слабоды, а таксама, асабліва ў далейшым, некаторыя этнаграфічныя асаблівасці абраднасці, фальклору і ўладкавання побыту (жылля, вопраткі, кухні). Паступова асіміляцыя закранула асобныя бакі гаворкі веткаўцаў, але ў цэлым стараверскі кансерватызм і рэлігійна-бытавая адасобленасць усё ж дыктавалі імкненне застацца ў ранейшых этнакультурных межах.

Значна ўмацавала аўтарытэт Веткі асвячэнне попом Хвядосам у 1695 г. царквы ў імя Пакрова Найсвяцейшай Багародзіцы – першай і адзінай у гэты перыяд у папоўцаў. Вакол царквы утварыўся стараверскі Пакроўскі манастыр, куды накіроўваліся паломнікі, якія не толькі спавядаліся і прычашчаліся, але і вучыліся «слоўнай грамаце». Веткаўская царква і манастыр на шматлікія дзесяцігоддзі становяцца цэнтрам палемікі, школай кніжнасці, іканапісу і крукавага спеву.

Да пачатку XVIII ст. Ветка была ўжо бачным і ўплывовым рэлігійным, гандлёвым і культурным цэнтрам старавераў-папоўцаў і заняла значнае месца ў гісторыі і культуры беларускіх земляў. Услед за Пакроўскім манастыром у першыя дзесяцігоддзі XVIII ст. узніклі іншыя манастыры і скіты як паблізу (у Старадубе), так і за межамі веткаўска-старадубскіх земляў.

Такое становішча Ветка захоўвала да сярэдзіны XVIII ст. – часу, калі рускі царызм, зацікаўлены ў вяртанні збеглых старавераў, ажыццявіў дзве спробы іх высялення: першую – у 1735 г., пасля якой старaверы зноў пачалі вяртацца ў Ветку, і другую, канчатковую – у 1764 г., калі слабада была цалкам спалена, знішчана мноства унікальных абразоў, старажытных кніг. Цэнтр папоўшчыны перанеслі ў Старадуб'е (цяпер Старадуб знаходзіцца ў Бранскай вобласці). З тых часоў Ветка як асноўны стараверскі цэнтр на тэрыторыі Беларусі спыняе сваё існаванне. Паказальна, што старaверы, якія жылі ў Ветцы, заклалі пачатак так званаму веткаўскаму сагласу. Пра яго пішуць шматлікія гісторыкі, пачынаючы з XVIII ст. і паказваючы яго адметныя асаблівасці. Уну-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трыпалітычныя падзеі ў Расійскай дзяржаве прывялі да таго, што папоўшчына становіцца неаднастайнай, у ёй з'явіліся так званыя згоды. Даследчыкі называюць розную іх колькасць, напрыклад, І. Жураўлёў (канец XVIII ст.) асноўнымі лічыць пяць: веткаўскую, дзяканаўскую, перамазанаўскую, епіфаньеўскую, чарнобыльскую [5, с. 206].

Найбольш вядомымі адметнымі рысамі стараверскага ўкладу жыцця, або так званымі «вольнасцямі», якія адрозніваюць веткаўскі саглас ад іншых, па меркаванні навукоўцаў, былі наступныя: а) веткаўцы падрыхтоўвалі і ўжывалі для святога памазання ўласныя духмяныя зёлкі – міра; б) падчас службы веткаўцы праводзілі трохразовае каджэнне: два разы прама і трэці – папярок; в) у веткаўцаў былі свае правілы прыняцця святароў і вернікаў, якія пераходзілі з праваслаўя ў стараверства; г) у абрадавай практыцы веткаўцы маглі выкарыстаць абразы, створаныя майстрамі іншай веры; д) не цураліся праваслаўных у побыце, хадзілі з імі ў лазню і інш.; е) заключэнне шлюбу праходзіла ў хатах; ж) не прызнавалі самаспаленні і г.д.

Веткаўскі саглас быў шырока вядомы, яго звычаяў прытрымваліся ў навакольных слабодах, а таксама на Кержынцы, у Старадуб'і, Маскве і іншых месцах. Так, удзельнікамі экспедыцый МДУ «праводзілася і працягваецца вывучэнне веткаўскай, або так званай "беглапапоўскай" традыцыі рускага казацтва Дона, Волгі і Урала, на малдаўскіх і ўкраінскіх землях, у Пермі і Падмаскоўі. У Навуковай бібліятэцы МДУ створаны малдава-ўкраінская, маскоўская і іншыя калекцыі, кожная з якіх уяўляе вызначаную мадыфікацыю веткаўскай стараверскай кніжнай традыцыі, а ўсё разам – гісторыю духоўнага жыцця і духоўных пошукаў яе носьбітаў з канца XVII ст. да сённяшняга дня» [6, с. 14]. Даследчыкі адзначаюць: «Цесныя сувязі рускіх перасяленцаў гэтых месцаў з Веткай пацвярджаюцца як гістарычнымі дадзенымі, так і блізкасцю іх кніжнай культуры і музычнага мастацтва» [7, с. 127].

## ЛІТАРАТУРА

1. Смоленский, С.В. О собрании русских древнепевческих рукописей в Московском Синодальном училище церковного пения / С.В. Смоленский // РМГ. – 1889.
2. Расторгуев, П.А. Словарь народных говоров Западной Брянщины / П.А. Расторгуев. – Минск: Наука и техника, 1973.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. Русские письменные и устные традиции и духовная культура (по материалам археографических экспедиций 1966 – 1980 гг.): сб. ст. / под ред. И.Д. Ковальченко. – М., 1982.
4. Из истории фондов Научной библиотеки Московского университета: сб. ст. / сост. И. Поздеева [и др.]. – Вып. 1 – 4. – М., 1973 – 1987.
5. Журавлёв (Иоаннов), А.И. Полное историческое известие о древних стригольниках, и новых раскольниках, так называемых старообрядцах / А.И. Журавлёв (Иоаннов). – СПб.: Императорская академия наук, 1799.
6. Поздеева, И.В. Археографические работы московского университета в районе древней Ветки и Стародуба (1970 – 1972 гг.) / И.В. Поздеева // Памятники культуры. Новые открытия. – М., 1976.
7. Агеева, Е.А. Территориальные книжные собрания и коллекции МГУ и их пополнения за 1981 – 1983 годы / Е.А. Агеева, Н.А. Кобяк, Е.Б. Смилянская // Из фонда редких книг и рукописей Научной библиотеки Московского университета: сб. ст. / под ред. Е.С. Карповой. – М., 1987.

***Драко Н.М.*** *(Беларусь, г. Мінск)*

## СЦЭНІЧНАЕ СЛОВА Ў БЕЛАРУСКІМ ТЭАТРАЛЬНЫМ МАСТАЦТВЕ АД ВЫТОКАЎ ДА ПАЧАТКУ XX СТ.

Сцэнічнае слова займае выключна важнае месца ў сістэме сродкаў выразнасці пры ўвасабленні драматычнага спектакля. Менавіта праз слова выканаўцы даносяць да гледача аўтарскую і рэжысёрскую задуму, ідэю, сэнс і звышзадачу сцэнічнага дзеяння. З дапамогай слова акцёр здольны змяніць трактоўку асобнага вобраза, узмацніць або зменшыць сілу яго эмацыянальнага ўздзеяння на гледача.

На працягу шматвяковай гісторыі тэатральнага мастацтва сцэнічнае слова эвалюцыяніравала, прыёмы моўнага ўвасаблення змяняліся. Беларускі драматычны тэатр праходзіў тыя ж самыя шляхі фарміравання і развіцця, што і тэатр заходнееўрапейскі, але на асобных гістарычных этапах той або іншы стыль



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ